**Вучэбная дысцыпліна «Метадалогія лінгвістычных даследаванняў»**

| | |
|---|---|
| Месца дысцыпліны ў структурнай схеме адукацыйнай праграмы | Адукацыйная праграма магістратуры (паглыбленая вышэйшая адукацыя) Спецыяльнасць: 7-06-0232-01 Мовазнаўства Цыкл спецыяльных дысцыплін: дзяржаўны кампанент * |
| **Кароткі змест** | Навуковае пазнанне як працэс. Метад, методыка, метадалогія. Структура мовазнаўства і структура лінгвістычнай метадалогіі. Спосабы навуковага даследавання. Метады эмпірычнага пазнання. Назіранне, вымярэнне, эксперымент. Метады тэарэтычнага (абстрактна-лагічнага) пазнання. Мадэліраванне. Аргументацыя навуковага даследавання. Інтэрпрэтацыя і выклад як этапы навуковага даследавання. Структура навукова-даследчага метаду. Апісальны метад і яго прыёмы інтэрпрэтацыі. Прыёмы ўнутранай інтэрпрэтацыі. Апазіцыйны аналіз. Дыстрыбуцыйны аналіз. Трансфармацыйны аналіз. Дыскрэтны аналіз. Прыёмы знешняй і міжузроўневай інтэрпрэтацыі. Параўнальна-гістарычны метад і яго прыёмы. Супастаўляльны (тыпалагічны) метад і яго прыёмы. Дапаможныя метады даследавання: статыстычны, псіхалінгвістычны, інструментальныя прыёмы, аўтаматызацыя лінгвістычнага даследавання. Крытэрыі навуковасці лінгвістычных ведаў. Прадстаўленыя вынікі даследавання. |
| **Фарміруемые кампетэнцыі, вынікі навучання** | Базавыя прафесійныя кампетэнцыі: ***ведаць:*** структуру, вытокі і лагічныя прынцыпы лінгвістычнай метадалогіі; магчымасці выкарыстання канкрэтных лінгвістычных метадаў і даследчых прыёмаў пры вывучэнні адзінак розных моўных узроўняў; спецыфіку лінгвістычных даследаванняў; магчымасці выкарыстання ў лінгвістычных даследаваннях камп’ютарна-інфармацыйных тэхналогій; прынцыпы і крытэрыі навуковасці лінгвістычных ведаў; ***умець:*** прафесіянальна аналізаваць лінгвістычныя работы ў аспекце іх тэарэтычнай асновы, дасягнення пастаўленых задач, выкарыстаных метадаў і дасягнутых вынікаў; даследаваць моўныя факты апісальным, параўнальна-гістарычным і супастаўляльна-тыпалагічным метадамі; планаваць і ажыццяўляць лінгва-семіятычныя даследаванні канкрэтных праблем, звязаных з існаваннем і выкарыстаннем мовы і/або іншых семіятычных праблем; ***валодаць:*** навыкамі даследчай работы з электроннымі базамі дадзеных па моўнай, тэкставай і лексікаграфічнай інфармацыі (нацыянальныя корпусы моў; электронныя версіі архіваў і бібліятэк; электронныя падручнікі; тэхналогіі дыстанцыйнага выкладання філалагічных дысцыплін); навыкамі арганізацыі і правядзення лінгвістычных і сацыяпсіхалінгвістычных эксперыментаў, а таксама эксперыментаў у навучанні пры выкладанні філалагічных дысцыплін у вну і сярэдняй школе; навыкамі эфектыўнага прадстаўлення вынікаў даследавання ў дысертацыі і навуковых публікацыях. |
| **Прэрэквізіты** | Агульнае мовазнаўства. |
| **Працаёмкасць** | 3 заліковыя адзінкі, 180 акадэмічных гадзін, з іх 104 аўдыторныя: 70 г лекцыйных і 34 практычных заняткаў. |
| **Семестр(ы), патрабаванні і формы бягучай і прамежкавай атэстацыі** | 1-ы семестр, залік.<br>2-і семестр, экзамен. |